ТРЭЦІ ЭТАП XXXVII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ
«БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2021 г.*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*

**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Ужыванне зборных лічэбнікаў з назоўнікамі часта выклікае пытанні. Прыдумайце просты сказ з прапанаванымі спалучэннямі (лічэбнікі запішыце словамі).

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 2.** Спалучыце часткі фразеалагічных адзінак са слупкоў 1 і 2, каб стварыць адну правільную фразему. Запішыце варыянты, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| 1 | 2 |
|---|---|
| прасіць | (на)росхрыст |
| надз…муцца як | свіння ў плоце |
| гады | (на)прамілы бог |
| душа | жаба на карчы |
| пі…чыць як | (не,ні) сваімі нагамі |
| ісці як | (у)рады |

**Заданне 3.** Падкрэсліце чацвёртае лішняе ў адпаведнасці з пазначанымі ў дужках характарыстыкамі. Патлумачце свой адказ.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 4.** Запоўніце табліцу: упішыце ў асобныя слупкі патрэбныя граматычныя формы слоў і іх фанетычную транскрыпцыю.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Узор:*

| Апісанне | Патрэбная граматычная форма | Транскрыпцыя |
|---|---|---|
| які вучыцца на адным курсе – **у родным склоне** | аднакурсніка | [аднаку́рс’н’іка] |

**Заданне 5.** Прачытайце сказы з нарыса У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх сінтаксічнай функцыяй. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В2Г6Д4Е7). Улічыце, што сінтаксічныя функцыі могуць паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | |
|---|---|
| А: Паўкруглы ўзгорак ***увесь у*** ільсняных глыбокіх ***барознах***. | 1. Дзейнік. |
| Б: Крыгі грувасцяцца адна на адну. ***Ледзяныя*** гмахі рвуць берагі, калоцяць іх. | 2. Частка дзейніка. |
| В: Ледзь, напрыклад, у Карпатах і на Валыні пойдуць летам асабліва моцныя дажджы – пачынае шалець рака ***Гарынь***. | 3. Выказнік. |
| Г: І вось астравок пасярэдзіне гэтага маленькага люстэрка вады аблюбаваў ***князь*** Алелькавіч-Слуцкі з пакалення Альгерда. | 4. Частка выказніка. |
| Д: Паляванне ***Аўгуста III у 1752 годзе***, калі звяроў выганялі праз калідор з жэрдак на вытанчанага забойцу і яго світу, перапалавініла звярынае насельніцтва [Белавежскай] Пушчы. | 5. Прыдатак. |
| Е: І, урэшце, значная частка ***зуброў*** [у Белавежскай пушчы] жыве проста на волі. | 6. Дапасаванае азначэнне. |
| | 7. Недапасаванае азначэнне. |

**Заданне 6.** Маладыя журналісты прынеслі ў рэдакцыю газеты некалькі нататак на розную тэматыку. Праз некаторы час рэдактар вярнуў ім матэрыял з указаннем на неабходнасць сур’ёзнай стылістычнай праўкі. Дапамажыце журналістам знайсці і выправіць памылку і патлумачыць яе прычыны або паказаць рэдактару, што памылкі няма (у гэтым выпадку замест тлумачэння напішыце: “памылкі няма”).

***Узор:***

| ***Сказ*** | ***Выпраўлены варыянт*** | ***Тлумачэнне*** |
|---|---|---|
| І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея зноў паўторыцца. | І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея паўторыцца. | *Паўтарыцца* – гэта значыць адбыцца зноў, яшчэ раз, таму ў спалучэнні *зноў паўторыцца* слова *зноў* лішняе. Памылка выклікана выкарыстаннем збыткоўнага слова (плеаназм). |

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| *№* | ***Сказ*** |
|---|---|
| 1. | Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзіць апытанне грамадскага меркавання па пытанні ўвядзення абмежаванняў на прымяненне піратэхнічных вырабаў. |
| 2. | Валанцёры наведаюць радзільню, дзе ўручаць сувеніры і падарункі з нацыянальным арнаментам 8 нованароджаным. |
| 3. | Шмат гадоў прайшло пасля першага выдавецтва рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні». |

| | |
|---|---|
| 4. | Сённяшняя моладзь павінна быць дзейнай, актыўнай. |
| 5. | Мы стараемся адаптавацца да зменлівых умоў і спадзяёмся, што пастаўленыя на наступны год задачы будуць дасягнуты. |
| 6. | Патрабаванні заказчыка патрабуецца выканаць у найбліжэйшы час. |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Столичные города, как и государства, как и народы, переживают периоды подъема и упадка. В период феодальной раздробленности столицами белорусских земель становились Полоцк, Туров, Гродно. Затем объединительную роль играли Новогрудок, Вильно. Но уже с конца XVI века, с образованием Несвижского княжества, с обновлением города, предпринятым реформатором и просветителем Николаем Криштóфом Радзивиллом Сироткой (1549–1616), Несвиж начал соперничать с Вильно, противостоять ему, а потом даже и Варшаве.

*(Адам Мальдис. Белорусские сокровища за рубежом)*

**Заданне 8.** Вызначце вершаваны памер, тып рыфмоўкі і сродак паэтычнага сінтаксісу ў вылучаным фрагменце. Адказы запішыце ў табліцу. Памятайце, што вершаваны памер вызначаецца па колькасці стоп у вершаваным радку (напрыклад, 5-стопны ямб).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | *Вершаваныя радкі* |
|---|---|
| А | ***Тлумачыць можна*** нават кіем,<br>***Тлумачыць можна*** і мятлою.<br>Нямыя размаўляюцьківам,<br>Вясёлых пальцаў<br>Мітульгою.<br>*Аляксей Пысін* |
| Б | Чужынцаў прагналі, баі адгудзелі.<br>Як травы шумліва ўзыходзяць ***у нас***!<br>Як радасна пушчы гамоняць ***у нас***!<br>Адгэтуль да нас і буслы паляцелі.<br>*Пімен Панчанка* |
| В | І ў ***белы дзень***, і ў ***чорну ноч***<br>Я ўсцяж раблю агледзіны,<br>Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,<br>Ці трутнем ён не з’едзены.<br>*Янка Купала* |
| Г | Хачу я ўспамінаць харобрых,<br>Адважных, сэрцу дарагіх...<br>***А можа быць, каб бачыць добрых,***<br>***Дык варта й помніць пра благіх?***<br>*Пятрусь Броўка* |

**Заданне 9.** Пазнаёмцеся з ацэнкамі розных герояў мастацкіх твораў беларускімі літаратуразнаўцамі. Пазнайце герояў, напішыце, з якіх яны твораў і хто гэтыя творы напісаў.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

***А. Валянціна Локун:*** «Першапачаткова характар <…> ствараўся аўтарам у традыцыйнай для яго манеры рамантызаванага пісьма. <Гераіня> захапляецца ідэяй змагання супраць фашыстаў, імкнецца далучыцца да падпольшчыкаў, якія ў яе ўяўленні паўстаюць у арэоле мужнасці і выключнасці. Але паступова прыходзіць уменне заўважаць праўду жыцця.. Жанчына праходзіць праз шэраг выпрабаванняў: загадкавая смерць бацькі, нямецкі канцлагер, затым савецкі гулаг, Сібір і, як вынік усяго гэтага, цяжкая хвароба сэрца. <…> Унутраны стан жанчыны ў фінале раскрываецца ўжо ў зусім іншай плоскасці – рэалістычна-драматычнай, нават трагедыйнай».

***Б. Міхась Тычына:*** «<…> сапраўдную цану зямлі ведаў <…>, але ён панёс гэтыя веды з сабой ў магілу. Ён першы захапіўся ідэяй набыць зямлю ва ўласнасць, каб працаваць на самога сябе, але ён жа першы адчуў і марнасць сваіх летуценняў. Кульмінацыяй была яго сустрэча з воўкам, калі герой стаў сведкам яго пагібелі, зазірнуў у твар смерці. Занадта шмат у жыцці і лёсе селяніна залежыць ад выпадковасці – нездарма <…> так бурна абмяркоўваюць новую кандыдатуру ляснічага, ад якога цалкам залежыць іх жыццё і дабрабыт. Вядома, акрамя выпадку, ёсць яшчэ і адвечныя законы зямнога быцця, якія ўмешваюцца ў ход падзей, не зважаючы на асабістыя пажаданні канкрэтнай асобы».

***В. Іван Навуменка:*** «<…> адчувае сябе ў доме <…> няўтульна. Мала таго, што яна не любіць Яўхіма, яна штогадзінна, штохвілінна ловіць на сабе злавесныя позіркі сямейнікаў: ты, галячка, прыйшла ў нашу хату, нічога з сабой не прынёсшы, то цані шчасце, якое табе выпала. Падобнае адчуванне вярэдзіць <…> душу, не шчаслівай яна сябе адчувае, а глыбока няшчаснай. А тут на сенажаці захварэла яе дачка…»

***Г. Міхась Тычына:*** «Прычыны паводзін герояў празаік шукае ў мінулым жыцці, а таму робіць адступленні ў перадгісторыю кожнага паасобку, што часам выглядае не зусім натуральна ў сюжэце, які з кожнай старонкай набывае напружанне. <…> А мастацтвазнаўца <…>, спецыяліст па італьянскай скульптуры ў мірныя часы, несамавіты кніжнік, “няўмека, які перажываў, што праставаты і малапісьменны старшына лепш за яго разбіраецца ў вайсковых абставінах, паводзіць сябе ўпэўнена і мужна, у адказную хвіліну не здрэйфіў, не здрадзіў сябрам і сваім стрэлам па ворагу папярэдзіў сяброў аб небяспецы».

**Заданне 10.** Успомніце Алеся Загорскага з рамана “Каласы пад сярпом тваім” Уладзіміра Караткевіча. У Вас ёсць шэсць чарадзейных каляровых капелюшоў, якія дораць адзін бал. Апраніце кожны капялюш і выканайце яго заданне.

Белы капялюш патрабуе канкрэтны факт пра Алеся Загорскага.

Жоўты – адзін станоўчы факт пра гэтага героя.

Чорны – адзін адмоўны факт пра яго.

Чырвоны – расказаць, якія эмоцыі выклікае Алесь Загорскі ў чытача.

Зялёны – з якімі іншымі літаратурнымі героямі беларускай ці сусветнай літаратуры можна параўнаць Алеся Загорскага і на якой падставе.

Сіні – адзін аргумент, чаму беларусам трэба ведаць пра герояў Уладзіміра Караткевіча.

*Увага! Капелюшы патрабуюць уважлівасці і дакладнасці выканання заданняў!*

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*